а также специалистов художественного профиля: телеведущих, режиссеров, сценаристов, операторов. Для всех сотрудников телевидения необходимо организовать постоянные курсы повышения квалификации по белорусскому, русскому и иностранному языкам. Белорусский телеэкран должен быть современным, высокохудожественным и интеллектуальным.

**Алена СМІРНОВА**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*(г. Мінск, Беларусь)*

## ПІСЬМЕННІК НА РАДЫЁ: З ГІСТОРЫІ СУПРАЦОЎНІЦТВА (40–80-я гг. XX ст.)

В статье рассматриваются основные этапы сотрудничества белорусских писателей с редакцией радио, особое внимание уделено периоду 40–80 гг. XX в. В годы Великой Отечественной войны белорусские писатели выступали активными субъектами радиоэфира, для этого периода характерны: мощное идеологическое начало, поэтизация героизма, чрезмерное использование экспрессивно-оценочной лексики и т. д. В 1950–1980 гг. участие писателей в радиопрограммах носило уже не стихийный, а системный, плановый характер.

*Ключевые слова:* радиопублицистика; радиопередача; образ автора; жанры радиовещания; радиовыступеление.

The article looks at the main stages of cooperation between Belarusian writers and the radio editors. Special attention is paid to the period of 1940–1980. During the Great Patriotic War Belarusian writers were active members of radio broadcasting. Important features of this period are following: a powerful ideological ground, poetization of heroism, excessive use of expressive-evaluative vocabulary, etc. The participation of writers in radio programs in 1950–1980 was no longer spontaneous but planned and systematic.

*Key words:* radiojournalism; radiobroadcast; author's image; broadcasting genres; radio performance.

Дыялог паміж пісьменнікам і аўдыторыяй традыцыйна наладжаны па схеме «твор – чытач», і такая «схема» мае аб'ектыўны характар: асоба пісьменніка часцей за ўсё схавана за вобразам аўтара. Аднак для поўнага пранікнення ў вобраз аўтара неабходна ўлічыць і ўсе экстралінгвістычныя фактары, ідэйную і грамадзянскую пазіцыю аўтара, якая выяўляецца не толькі праз мастацкія вобразы, але ў большай ступені праз адкрыты дыялог пісьменніка і чытача, мажлівасць якога забяспечваюць сродкі масавай інфармацыі. Мэтазгодна лічыць, што найбольш дзейсная платформа ў гэтых

адносінах – аўдыявізуальная, паколькі яна дазваляе арганізаваць дыялог адкрыта, без пасрэдніцтва журналісцкіх інтэрпрэтацый.

Радыёперадача, створаная ў разліку на жывое маўленне, мадыфікуе і сваю фанетыка-марфалагічную, стылістычную, сінтаксічную, эмацыянальна-вобразную структуру. У любым радыёвыступленні не можа не выявіцца асоба аўтара, яго ідэйны, маральна-псіхалагічны, жыццёвы вопыт, яго адносіны да прадмета размовы, адным словам – яго пазіцыя. Гэта праяўляецца і ў выбары матэрыяла, і ў характары яго асэнсавання, і ў сістэме прыёмаў, з дапамогай якіх ён даносіць інфармацыю да слухача.

У гісторыі радыёжурналістыкі былі перыяды, калі слова пісьменніка мела вагу і вялікую сілу ўздзеяння. У першай палове 30-х гг. ХХ ст. у радыёкамітэце працавалі Лукаш Калюга (1933), Тодар Кляшторны (1933), Аркадзь Куляшоў (1934–1936 гг.), Сяргей Грахоўскі (1935) і інш. Аднак найбольш паказальнымі гістарычнымі перыядамі ў гэтых адносінах можна лічыць гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама перыяд 60–80-х гг. ХХ ст., адзначаны росквітам літаратурна-драматычнага вяшчання, развіццё якога самым непасрэдным чынам звязана з развіццём літаратуры.

У гады Вялікай Айчыннай вайны формы, жанры радыёвяшчання зведалі прыкметныя змены, назіралася перавага тэкставых матэрыялаў з рэдкім выкарыстаннем гуказапісу на месцах. Найбольш дзейсным і папулярным жанрам стала радыёпрамова. Галоўная ўмова эфектыўнасці радыёпрамовы – глыбокая ўпэўненасць аўтара ў тым, пра што ён гаворыць, шчырасць, спавядальнасць. Адзін з самых яркіх прыкладаў удзелу беларускіх пісьменнікаў у рабоце радыёвяшчання ў гады Вялікай Айчыннай вайны звязаны з дзейнасцю радыёстанцыі «Савецкая Беларусь» пры Цэнтральным штабе партызанскага руху ў Маскве, якая пачала сваю працу 1 студзеня 1942 г. і да канца вайны ажыццявіла 3270 перадач.

Падчас вайны з беларускім радыё актыўна супрацоўнічалі Янка Купала, Якуб Колас, Кандрат Крапіва, Міхась Лынькоў, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка, Кузьма Чорны, Аркадзь Куляшоў, Максім Танк, Ілья Гурскі, Анатоль Астрэйка, Пімен Панчанка і інш. Пісьменнікі выступалі з прамовамі, артыкуламі, фельетонамі, памфлетамі, іншымі матэрыяламі.

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захаваліся некаторыя тэксты выступленняў беларускіх пісьменнікаў перад мікрафонам у эфіры радыёстанцыі «Савецкая Беларусь» падчас Вялікай Айчыннай вайны. Сярод такіх – *«Кліч да беларускага народа»,* з якім у лютым 1942 г. звярнуўся да слухачоў паэт Янка Купала. Аўтар «не шкадуе» экспрэсіўнай лексікі для апісання ворага: *«зграі гітлераўскіх гадаў, найагіднейшыя і самыя азвярэлыя*

*з чужынцаў»*, *«подлы вораг»*, *«крывавы бандыт і грабежнік», «хітрая нямецкая шэльма»* [1, с. 2].

Актыўным змагаром у радыёэфіры выступаў і Кандрат Крапіва. У яго прамовах па радыё знітаваліся і нянавісць да ворага, і клопат пра беларускага салдата, і жах ад спустошанай роднай зямлі, і вера ў будучыню беларускай зямлі, у неперамажнасць і справядлівасць народа-змагара. Радыёвыступленні часта не мелі назваў, але гэта не значыць, што яны згубіліся сярод мноства плёнак ваеннага часу. Адно з такіх – выступленне Кандрата Крапівы 12 жніўня 1942 г. Ці не ўпершыню ў публіцыстычных выступленнях ваеннага часу сустракаецца вельмі праўдзівая і дакладная заклапочанасць пісьменніка настроем свайго народу: *«Калі сярод вас ёсць такія, якія стаміліся ў барацьбе і ўпалі ў адчай, падтрымайце іх і падбадзёрце»* [1, с. 91]. У гэтых радках выразна выяўляецца чалавечая пазіцыя пісьменніка, які глыбока разумее пачуцці народа, дапускае, што ёсць тыя, хто сапраўды стаміўся, страціў веру, але гэта не павінна стаць прадметам асуджэння, а хутчэй падставай для праявы найлепшых чалавечых якасцяў – жадання дапамагчы, аптымізму.

Публіцыстычныя радыёвыступленні пісьменнікі часта спалучалі з чытаннем новых твораў, часцей за ўсё вершаў. Падобныя вершы, асабліва напісаныя па гарачых слядах гістарычных падзей, – прыклад публіцыстычнага твора ў вершаванай форме, а гэта павышае цікавасць да яго, паколькі твор адразу набывае ў актуальнасці, фактaлагічнасці, становіцца не проста фактам літаратурным, а, у пэўнай ступені, і гістарычным.

*50–80 гг. ХХ ст.* У пасляваенныя гады буйнейшыя паэты і празаікі Беларусі, пераймаючы эстафету ваенных год, працягвалі выступаць перад слухачамі з публіцыстычнымі нататкамі, гутаркамі, нарысамі; творчыя магчымасці пісьменнікаў-радыёжурналістаў асабліва плённа выкарыстоўваліся ў пасляваенны перыяд ў праграмах Галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё, дзе ў розныя перыяды працавалі ў якасці рэдактараў або ўзначальвалі рэдакцыю драматург Мікалай Матукоўскі (1960–1966); паэт Юрась Свірка (1961–1974); паэт, празаік Мікола Чарняўскі (1962–1965); празаік, перакладчык Анатоль Кудравец (1963–1965); паэт Хведар Чэрня (1966–1979); паэт, перакладчык Казімір Камейша (1968–1979); паэт-песеннік, празаік, перакладчык Віктар Шымук (1977–1990); паэт, публіцыст Васіль Макарэвіч (1979–1990-е); паэт Навум Гальпяровіч (з 1990-х па сёння).

Пасляваеннае дзесяцігоддзе – гэта вельмі паказальны і цікавы перыяд у гісторыі краіны, для якога характэрна перш за ўсе – аднаўленне, прычым не толькі будаўнічых аб’ектаў, а ў большай ступені грамадскага настрою, веры ў светлую сацыялістычную будучыню. Гэты пасыл быў вельмі арганічным

менавіта ў той час, на хвалі перамогі. Пазней выклікаў пэўную скептычнасць, а ў наш час нават і крытыку.

З сярэдзіны 1960-х гг. значна павялічваецца колькасць радыёнарысаў і радыёапавяданняў ў эфіры, змяняецца іх тэматыка і героі. У пасляваенныя гады радыёнарысы прысвячаліся ў асноўным палітычным дзеячам, героям рэвалюцыі, буйным навукоўцам, артыстам. З сярэдзіны 1960-х гг. героямі ўсе часцей становяцца звычайныя героі працы, рабочыя, калгаснікі, прадстаўнікі інтэлігенцыі. З тэкстаў пастулова знікае патэтыка, агульныя словы.

Практычна ўсе пісьменніцкія выступленні ў друку, па радыё прысвячаліся ці то з'ездам партыі, ці то гадавіне сацыялістычнага будаўніцтва. Радыйны мікрафон ператвараўся ў трыбуну, адкрытую не толькі для журналістаў, але і для пісьменнікаў. Больш за тое, менавіта на пісьменнікаў рабілася стаўка. Пра гэта сведчаць і наступныя дакументы. Так, у справаздачнай даведцы (1958) аб рабоце Галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання ў сувязі з падрыхтоўкай да 40-годдзя БССР напісана: «*Пасля справаздачы рэдакцыі на Камітэце прайшло тры с палавінай месяцы. Нам было паказана, што рэдакцыя працуе без дастатковай творчай сувязі з пісьменнікамі і другімі аўтарамі. / ... / Супрацоўнікі рэдакцыі ўлічылі гэтыя заўвагі, і, нягледзячы на тое, што летні перыяд быў дастаткова цяжкім, таму што пісьменнікі ў большасці сваёй адсутнічалі, прыцягнулі да работы значную колькасць аўтараў*» [3, с. 37].

Пісьменніцкія выступленні заўсёды былі чаканымі ў гадавіну Перамогі (выступленні, вершы пісьменнікаў-франтавікоў), да юбілеяў Леніна, да Дня Касманаўтыкі, да чарговага камуністычнага суботніка і г. д.

Адной з праграм, якая актыўна выкарыстоўвала публіцыстычнае слова і аператыўна даносіла да сучасніка слова пісьменніка стала праграма «Трыбуна пісьменніка» (на мікрафонных папках часцей за ўсе сустракаецца назва «Трыбуна пісьменніка і журналіста» – аўт.), праграма выходзіла ў 1950–1970 гг. з рознай перыядычнасцю і прадстаўляла сабой радыёвыступленне па пэўнай, загадзя акрэсленай тэме. Хранаметраж – 10–15 хвілін. Тэмы часцей за ўсё тычыліся агульнаграмадскіх праблем. Так, 29 сакавіка 1958 г. пісьменнік Макар Паслядовіч выступіў з прамовай, прысвечанай рашэнням лютаўскага Пленума ЦК, закрануў праблему рэарганізацыі машынна-трактарных станцый [3, с. 165]. У верасні 1959 г. Уладзімір Карпаў падзяліўся са слухачамі тым, што, збіраючы матэрыял для другой кнігі рамана «Вясеннія ліўні», ён наведаў слаўны рабочы горад Горкі, і яго вельмі ўразілі маштабы дзейнасці горкаўскіх будаўнікоў: *«Будуюцца дарогі, масты, заводскія карпусы, цэлыя пасёлкі, вуліцы. Я ніколі не бачыў столькі вывернутай зямлі!»* [5, с. 228].

Праграма «Пісьменнікі перад мікрафонам» – «многафункцыянальная», паколькі выходзіла з рознай нагоды: выхадам новай кнігі («Аб новых кнігах») ці то ў адказ на існаванне якой-небудзь праблемы альбо проста ўяўляла сабой творчую сустрэчу пісьменніка са сваімі чытачамі, адпаведна пасля агульнай назвы канкрэтызавалася тэма. У лютым 1958 г. ў рамках гэтай праграмы адбылася сустрэча пісьменнікаў-воінаў са сваёй аўдыторыяй, праграма атрымала назву «Пісьменнікі-воіны перад мікрафонам», выступілі ўдзельнікі літаратурнага аб’яднання, якое існавала пры рэдакцыі газеты «Во славу Родины», прачыталі свае творы, падзякавалі старэйшым беларускім пісьменнікам за дапамогу, якія тыя аказваюць маладым аўтарам [2, с. 164]. Часам перад мікрафонам з’яўляліся і рэгіянальныя літаратары, напрыклад, «Перад мікрафонам літаратары Гомельшчыны» «Маладыя пісьменннікі Маладзечаншчыны перад мікрафонам» і інш.

Інфармацыйнай падставай для з’яўлення пісьменніка ля мікрафона былі вядома не толькі падзеі дзяржаўнага маштабу, але і лакальныя, якія тычыліся непасрэдна літаратуры. Многія праграмы, прысвечаныя пытанням літаратуры, часцей за ўсё аб’ядноўвала назва «літаратурная перадача». Пад агульнай назвай «Літаратурная перадача» выходзілі ў эфір і «Расказы аб бачаным», якія ўяўлялі сабой агучаныя аўтарам падарожныя нататкі, уражанні ад пэўных вандровак, часцей за ўсе замежных. Так, 14 красавіка 1958 г. сваімі ўражаннямі ад паездкі ў Пекін на працягу паўгадзіны са слухачамі дзяліўся Максім Танк [4, с. 26]. Пісьменнік быў у Пекіне падчас святкавання восьмай гадавіны абвяшчэння КНР. Пад уздзеяннем паездкі паэт напісаў некалькі новых вершаў, некаторыя з якіх агучыў у эфіры («Ля варот Цяньаньмынь», «Ван Суй», «Мост вечнага спакою», «Белы конь», «Вялікая Кітайская сцяна»).

Вялікай папулярнасцю ў 1970-я гг. карысталася праграма «Наша радыёбібліятэка» па кнігах мастацкай і дакументальнай прозы і паэзіі выдавецтва «Мастацкая літаратура», у якой кожны тыдзень удзельнічалі пісьменнікі, журналісты, выкладчыкі вну, настаўнікі школ. Звычайна праграмы будаваліся ў выглядзе радыёкампазіцый: спачатку ішоў аўтарскі тэкст, які ілюстраваўся ўрыўкамі з яго твораў.

Адзін раз на два-тры тыдні ў эфір выходзіла праграма «Творчыя партрэты пісьменнікаў», дзякуючы якой радыёслухачы атрымлівалі поўнае ўяўленне пра жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Хранаметраж праграмы – паўгадзіны, удзельнічалі, як правіла, самі пісьменнікі, крытыкі, гучалі лепшыя вершы, апавяданні, урыўкі з найбольш вядомых раманаў і аповесцей.

Радыёчасопіс «Паэзія» больш за дзесяць гадоў быў у эфіры Беларускага радыё. «Запеўку» «Паэзіі» звычайна давалі вядомыя паэты Пятрусь Броўка,

Максім Танк, Аркадзь Куляшоў, Пімен Панчанка, Максім Лужанін, Кастусь Кірыенка, Анатоль Астрэйка, Сяргей Грахоўскі і інш. У радыёчасопісе існавала некалькі рубрык: «Мой любімы паэт», «З паэтычнай спадчыны», «Ідзе паэтычная змена», «З паэтычнай фанатэкі», «Новыя пераклады». За паўгадзіны праграмы выходзіла 5–6 пісьменніцкіх выступленняў. Напрыклад, ліпеньскі выпуск «Паэзіі» 1965 г. адкрылі санеты Алеся Звонака. Дыктар нагадаў слухачам пра творчасць паэта, а потым перадаў слова самому паэту, які расказаў пра форму паэтычнага твора – санет, зачытаў некалькі сваіх новых твораў.

Эфектыўнай формай прапаганды беларускай літаратуры і творчасці асобных літаратараў стала арганізацыя радыёвечароў пісьменнікаў. Але часцей за ўсё пісьменнікі прымалі тут апасродкаваны ўдзел, таму што праграмы ішлі ў запісе, вершы чыталі не самі аўтары, а дыктары. Такія радыёвечары былі блізкія да літаратурна-музычных кампазіцый, аднак апошнія адрозніваліся дэталёвым рэжысёрскім сцэнарыем, дакладнай жанравай прыналежнасцю і г. д. Акрамя радыёвечароў, праводзіліся і радыёдні, часта з непасрэдным удзелам пісьменнікаў.

Безумоўна, асноўнай платформай для арганізацыі дыялогу паміж пісьменнікам і яго аўдыторыяй была рэдакцыя літаратурна-драматычнага вяшчання, менавіта ў яе тэматычных планах часцей за ўсё сустракаліся пісьменніцкія прозвішчы. Тым не менш, пісьменніцкае публіцыстычнае слова актыўна выкарыстоўвала і дзіцячая рэдакцыя («Аб кнізе, якая яшчэ ў чарнільніцы», «Да вас новая кніжка ідзе», «Беларускія пісьменнікі – дзецям» і інш.), і рэдакцыя «Апошніх паведамленняў» (напрыклад, удзел пісьменнікаў у трансляцыях парадаў і дэманстрацый), і рэдакцыя прапаганды (радыёгазета «Тыдзень нашага жыцця», «З блакнота пісьменніка» і інш.).

Такім чынам, аналізуючы гэтыя перыяды, можна зрабіць наступныя высновы. У гады Вялікай Айчыннай вайны беларускія пісьменнікі выступалі актыўнымі суб’ектамі радыёэфіру; нягледзячы на пэўныя цяжкасці ў прысутнасці пісьменнікаў перад мікрафонам, супрацоўнікі рэдакцыі радыё выкарыстоўвалі кожную магчымасць, каб гэту прысутнасць забяспечыць. Для радыёвыступленняў названага перыяду характэрны наступныя рысы: асабістасць выступлення, моцны ідэалагічны пачатак, катэгарычнасць, часам назіраецца прыхарошванне сітуацыі, пафасная паэтызацыя гераікі барацьбы, празмернае выкарыстанне экспрэсіўна-ацэначнай лексікі, зваротаў і г. д. У 50–80-я гг.XX ст. удзел пісьменнікаў у радыёпраграмах насіў ужо не стыхійны, а сістэмны, планавы характар. Прозвішчы пісьменнікаў упісваліся ў рэдакцыйныя планы побач з іншымі супрацоўнікамі, іх запрашалі да мікрафона не толькі з нагоды выхаду новай кнігі, але і для асэнсавання грамадскіх праблем. Напэўна, таму так кантрасціруе з мінулым вопытам наступны перыяд – 1990–

2001 гг., бурны супярэчлівы час, калі адбылося пераасэнсаванне рэчаіснасці, стала фарміравацца новае мысленне не толькі ў дачыненні да гістарычнага шляху краіны, але, і лакальных працэсаў, а дакладней, да развіцця радыёвяшчання, яго ролі ў жыцці грамадства.

**Библиографические ссылки**


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 871. Воп. 1, адз. зах. 6. – Тексты выступлений на радио ученых, общественных деятелей 1.02.1942 – лістапад 1942. – 112 л.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 871. Воп. 2, адз. зах. 201. – Тексты литературно-музыкальных передач и радиокомпозиций. – Т. 1. – 13.01.1958–19.02.1958. – 194 л.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 871. Воп. 2, адз. зах. 202. – Тексты литературно-музыкальных передач и радиокомпозиций. – Т. 2. – 19.02.1958–9.04.1958. – 185 л.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 871. Воп. 2, адз. зах. 203. – Тексты литературно-музыкальных передач и радиокомпозиций. – Т. 3. – 10.04.1958–23.05.1958. – 221 л.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 871. Воп. 2, адз. зах. 275. – Тексты литературно-музыкальных передач и радиокомпозиций. – Т. 4. – 01.06.1959–29.09.1959. – 233 л.



**Татьяна СОЛОДОВНИКОВА**
*Белорусский государственный университет*
*(г. Минск, Беларусь)*


# ДИСКУРС КОММЕРЧЕСКОЙ, ПОЛИТИЧЕСКОЙ И СОЦИАЛЬНОЙ РЕКЛАМЫ В ФОКУСЕ СОВРЕМЕННЫХ СТРАТЕГИЧЕСКИХ ИССЛЕДОВАНИЙ*


В статье приведены различные точки зрения на такой сложный коммуникативный феномен, как рекламный дискурс в аспекте современных дискурсивных исследований. Рекламный дискурс рассматривается не только как мощный инструмент воздействия на сознание адресата /ов, но и как один из эффективных способов формирования новой экономической, политической и социальной реальности. При этом театральность рекламного дискурса представляется неотъемлемой составляющей его презентационных стратегий.



*Ключевые слова:* дискурс-анализ; рекламный дискурс; манипулирование; воздействие; инструмент; коммуникация.



The article presents various points of view on such a complex communicative phenomenon as an advertising discourse in the aspect of modern discursive research. The advertising discourse is considered not only as a powerful tool for influencing the